Источник: "Навука" - 2017-09-11

**13 верасня а 14-й гадзіне ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі (г. Мінск, вул. Сурганава, 15, інфармацыйна-выставачны цэнтр, пакой 110) адбудзецца прэзентацыя выданняў, якія падрыхтаваны супрацоўнікамі ЦНБ НАН Беларусі і выйшлі ў Выдавецкім доме «Беларуская навука».**



# СКАРЫНАЎСКІЯ ВЫДАННІ

Выданне **«Францыск Скарына: асоба, дзейнасць, спадчына»** (укладальнік – дырэктар бібліятэкі доктар гістарычных навук А.І.Груша) уяўляе сабой зборнік артыкулаў, прысвечаных асобе, дзейнасці і спадчыне Францыска Скарыны. Аўтары артыкулаў – прадстаўнікі розных краін і галін гуманітарных ведаў – разглядаюць пытанні, якія звязаны з перадумовамі дзейнасці Скарыны, тыпамі і моўнай мадэллю яго перакладаў кніг Біблii, значэннем асобных сімвалічных выяў Скарыны, месцазнаходжаннем яго друкарні ў Празе.

Каталог **«Кириллические издания XVI века»** (складальнікі – група супрацоўнікаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў: А.І.Цітавец, В.А.Губанава, П.Д.Скурко, І.Л.Мурашова) распачынае серыю каталогаў, прысвечаных кніжнай калекцыі кірылічных выданняў з фондаў ЦНБ НАН Беларусі, і ўтрымлівае навуковае апісанне 25 экземпляраў 20 выданняў, якія выйшлі з друкарняў Вільні, Заблудава, Масквы і Астрога ў XVI ст.

Выданне **«Евангелле 1575 года – помнік славянскага кнігадруку XVI стагоддзя»** прысвечана адной з самых выдатных кніг славутага беларускага друкара Пятра Цімафеева Мсціслаўца – Евангеллю напрастольнаму, надрукаванаму ў Вільні ў доме Мамонічаў. Асаблівая ўвага засяроджваецца на экзэмплярах акадэмічнай бібліятэкі.

Наведвальнікам будзуць прапанаваны дзве тэматычныя выставы. Першая экспазіцыя пад назвай **«Біблii Рускай Францыска Скарыны – 500 гадоў»** падрыхтавана бібліятэкай імя Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук. Яе першая прэзентацыя ў Беларусі адбылася ў маі гэтага года ў Полацку падчас Беркаўскіх чытанняў. Гэта дзевяць стэндаў з унікальнай візуальнай і тэкставай інфармацыяй: пісьменства ў Вялікім Княстве Літоўскім даскарынавых часоў, асаблівасці біяграфii і кніг Скарыны, памяць пра Скарыну ў Беларусі, Літве, Чэхіі ў наш час і інш. Можна пабачыць месцы, у якіх жыў і працаваў Скарына, параўнаць сродкі і вобразы, якія ўвасабляюць памяць пра першадрукара ў краінах Еўропы.

Другая экспазіцыя **«Са спадчыны паслядоўнікаў Скарыны»** падрыхтавана аўтарскім калектывам каталога кірылічных выданняў. На ёй можна пабачыць частку экзэмпляраў, адлюстраваных у выданні: Евангелле ананімнай маскоўскай друкарні (1558/1559), віленскае Евангелле (1575), Астрожскую Біблію (1581), маскоўскі «Апостал» (1597) і іншыя.

**Аляксандр СЦЕФАНОВІЧ,**
**загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў**
**Цэнтральнай навуковай бібліятэкі**
**НАН Беларусі**